**ГРАМАДСКАЯ КАМПАНІЯ**

**«ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»**

# ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ШОСТАГА СКЛІКАННЯ

**Аналітычная тыднёвая справаздача па выніках назірання**

**18.07.2016–24.07.2016 г.**

Назіранне ажыццяўляюць РПГА «Беларускі Хельсінкскі камітэт» і ПЦ «Вясна» ў рамках кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары».

## ВЫСНОВЫ

– ініцыятыўныя групы выбаршчыкаў па вылучэнні прэтэндэнтаў на кандыдата у дэпутаты ажыццяўляюць збор подпісаў шляхам правядзення вулічных пікетаў і абыходу выбаршчыкаў па месцы іх жыхарства без істотных перашкодаў;
– пры зборы подпісаў зноў выкарыстоўваецца адміністрацыйны рэсурс, але не так шырока, як у мінулыя кампаніі;
– зарэгістраваныя палітычныя партыі Беларусі вылучаюць патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў;
– выбарчая кампанія працягвае заставацца малапрыкметнай для беларускага грамадства; дзяржаўныя СМІ змяшчаюць афіцыйныя матэрыялы ЦВК і артыкулы пра патэнцыйных праўладных кандыдатаў у дэпутаты.

## ЗБОР ПОДПІСАЎ

Ініцыятыўныя групы па вылучэнні патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты працягваюць збор подпісаў шляхам правядзення вулічных пікетаў і абыходу выбаршчыкаў па месцах іх жыхарства. Адзначана слабая цікавасць грамадзян да выбарчай кампаніі. РГА «Белая Русь» актыўна далучылася да збору

подпісаў у падтрымку праўладных кандыдатаў. Выкарыстоўваецца адміністрацыйны рэсурс для прасоўвання праўладных кандыдатаў.

У г. Светлагорску дзеючы дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Светлагорскай ВА № 46, старшыня раённай арганізацыі ГА «Беларускі Саюз жанчын» Галіна Філіповіч актыўна выкарыстоўвае адміністрацыйны рэсурс: кіраўнікі прадпрыемстваў раяць сваім падначаленым ставіць подпісы ў яе падтрымку і ігнараваць іншых прэтэндэнтаў. Подпісы за Філіповіч збіраюць на ААТ «Светлагорскі цэлюлозна-картонны камбінат», ААТ «Светлагорскхімвалакно», ААТ «Светлагорскі завод ЖБВіК». На пікетах у падтрымку Галіны Філіповіч збіраў подпісы назіральнік ад БРСМ.

У г. Слуцку на прадпрыемстве КУП «Слуцкае ЖКГ» зафіксаваны выпадкі прымусовага збору подпісаў за вылучэнне рэдактара газеты «Слуцкі край» Валянціны Ражанец.

У г. Маладзечна ініцыятыўная група па вылучэнні прэтэндэнта на кандыдата ў дэпутаты намесніка старшыні райвыканкама па пытаннях сацыяльнай сферы і ідэалагічнай работы Людмілы Кананові таксама задзейнічала адміністрацыйны рэсурс: на прадпрыемствах бюджэтнай сферы подпісы збіраюцца ў працоўны час.

У г. Орша педагогаў адклікалі з чарговага адпачынку і накіравалі збіраць подпісы ў падтрымку дзеючага дэпутата Палаты прадстаўнікоў па Аршанскай гарадской ВА № 26 Людмілы Дабрынінай. Такая ж сітуацыя ў г. Гродна: настаўнікі збіраюць подпісы ў падтрымку дырэктара сярэдняй школы № 13 Ліліі Кірак, якая вылучаецца прэтэндэнтам у кандыдаты па Гродзенскай-Цэнтральнай ВА № 51.

У г. Полацку наведвальніку палікінікі непасрэдна падчас прыёму ў доктара прапанавалі паставіць подпіс за вылучэнне дзеючага дэпутата Палаты прадстаўнікоў па Полацкай гарадской ВА № 28 Наталлі Гуйвік. На прыёме ў кабінеце знаходзілася трэцяя асоба – таксама медсястра – з падпісным аркушам. Грамадзянін паскардзіўся на гэты выпадак у ЦВК. У адказе гаворыцца, што парушэння выбарчага заканадаўства не заўважана: сябра ініцыятыўнай групы зайшла на працу ў свой вольны час, а будынак медычнай установы не ўваходзіць у пералік месцаў, дзе забаронена збіраць подпісы.

У г. Верхнядзвінску склалася такая практыка: у ініцыятыўную групу праўладнага кандыдата ўключаюць людзей, якія працуюць на буйнейшых прадпрыемствах. І калі ініцыятыўная група складаецца са 120-ці чалавек, як у

начальніка Полацкага раённага вузла электрасувязі Андрэя Юніцына, то кожнаму сябру застаецца сабраць на сваім працоўным месцы не больш за 10 подпісаў.

У Крычаўскай ВК № 83 працягваецца збор подпісаў у падтрымку старшыні Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў, члена КПБ Таццяны Марачковай з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурса. Кіраўніцтва ААТ «Крычаўцэменташыфер» арганізоўвае гэта ў працоўны час.

Выбарчая актыўнасць прэтэндэнтаў у кандыдаты і іх ініцыятыўных груп у рэгіёнах розная. У г. Слуцку сёлетняя кампанія ідзе даволі актыўна: некалькі ініцыятыўных груп прэтэндэнтаў у кандыдаты (Арцёма Маліноўскага, Аліны Нагорнай, Валянціны Ражанец) сур’ёзна займаюцца зборам подпісаў. Каманда прэтэндэнта Кацярыны Шуст скарыстала магчымасці выбарчай кампаніі і збірае подпісы таксама за перайменаванне адной з вуліц горада. Адбываюцца пікеты прэтэндэнтаў (Нагорная, Шуст, Ражанец). У мясцовых незалежных СМІ ўсё больш інфармацыі пра выбары. У той жа час у г. Маладзечна ад пачатку рэгістрацыі ніводная ініцыятыўная група не выходзіла ў пікет па зборы подпісаў. Са слоў мясцовага актывіста, прэтэндэнта ў кандыдаты Міхася Валынца, у яго збор подпісаў ідзе марудна, нягледзячы на вялікую колькасць сяброў ініцыятыўнай групы (57 чалавек).

У выбарчыя камісіі Мінска паступілі скаргі на празмерную актыўнасць асобных ініцыятыўных груп, якія збіраюць подпісы непасрэдна на паверхах у інтэрнатах. У сувязі з гэтым старшыня Мінскай гарадской ВК Сяргей Хільман на пасяджэнні выбаркама заявіў, што сябры ініцыятыўных груп патэнцыйных кандыдатаў у дэпутаты павінны выконваць правілы наведвання інтэрнатаў. Была дадзена ўстаноўка, паводле якой дазволена збіраць подпісы толькі ў холах першых паверхаў інтэрнатаў, а таксама каля будынкаў інтэрнатаў.

Прэтэндэнтам у кандыдаты, якія з’яўляюцца сябрамі апазіцыйных партый, Юрыю Казакевічу (Баранавіцкая-Заходняя ВА №5) і Мікалаю Чарнавусу (Баранавіцкая-Усходняя ВА №6) былі вынесены папярэджанні «за агітацыю» – выкарыстанне падчас збору подпісаў слоганаў (на стэндзе пікета і на адзенні). Гэта паставіла іх у няроўныя ўмовы з праўладнымі прэтэндэтамі ў кандыдаты, якім за слоганы папярэджанні не выносяцца. Трэба адзначыць, што 19 ліпеня пасля абскарджвання папярэджанні двум апазіцыйным прэтэндэнтам у кандыдаты былі адменены.

Некаторыя выканкамы і адміністрацыі раёнаў ужо прынялі рашэнні аб вызначэнні месцаў для правядзення перадвыбарчай агітацыі (месцы правядзення сустрэч з выбаршчыкамі і памяшканні для такіх сустрэчаў) і размяшчэння візуальнай агітацыйнай прадукцыі.

З даклада старшыні КДБ Беларусі Валерыя Вакульчыка кіраўніку дзяржавы 18 ліпеня вынікае, што КДБ займаецца не толькі пытаннямі бяспекі, але і кантралюе палітычныя аспекты выбарчай кампаніі. Нагадаем, што Валерый Вакульчык заявіў пра «нізкі ўзровень цікавасці грамадзян Беларусі да прэтэндэнтаў з ліку прадстаўнікоў розных апазіцыйных структур»[1].

## ВЫЛУЧЭННЕ ПАТЭНЦЫЙНЫХ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ПАЛІТЫЧНЫМІ ПАРТЫЯМІ

Адбыліся з’езды палітычных партый па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты.

| Партыя | Вылучана кандыдатаў у дэпутаты |
|---|---|
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (РППС) | 23 |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) | 34 |
| Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» | 50 |
| Камуністычная партыя Беларусі (КПБ) | 59 |
| Аб’яднаная грамадзянская партыя (АГП) | 70[2] |
| Партыя БНФ | 72 |
| Ліберальна-дэмакратычная партыя Рэспублікі Беларусь (ЛДПБ) | 110 |

## СМІ

Старшыня Назіральнага савета па кантролі за выкананнем парадку і правілаў правядзення перадвыбарчай агітацыі ў СМІ, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар Луцкі патлумачыў правілы выкарыстання сацсетак у перадвыбарчай агітацыі: «кандыдату ў дэпутаты не забаронена карыстацца сацыяльнымі сеткамі ў агітацыйных мэтах пры ўмове, што ў такую дзейнасць

[1] Даступна на: http://www.belta.by/society/view/vybory-2016-vakulchik-otmechaet-vysokuju-aktivnost-parlamentskoj-izbiratelnoj-kampanii-v-belarusi-202262-2016/.
[2] Сярод іх каля 30 прадстаўнікоў аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя».

не будуць укладваецца матэрыяльныя сродкі»[3]. Эксперты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» лічаць, што пры адсутнасці дэтальна прапрацаваных працэдур прымяненне падобнай нормы на практыцы выкліча мноства пытанняў.

Як і раней, дзяржаўныя СМІ асвятляюць кампанію неактыўна і робяць гэта па-ранейшаму аднабакова, на карысць праўладных кандыдатаў. Змест шэрагу публікацый расцэньваецца як прыхаваная агітацыя за такіх кандыдатаў.

Газета «Веснік Магілёва» ад 20.07.2016 дае артыкул пад назвай «Главный врач Могилёва идёт в парламент» у падтрымку галоўнага ўрача цэнтральнай гарадской паліклінікі Аляксандра Старавойтава.

Газета «Гродзенская праўда» ад 20.07.2016 публікуе артыкул пад назвай «Прафсаюзы заўсёды побач» пра дзейнасць патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты, старшыні Гродзенскай абласной арганізацыі прафсаюзаў работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў Валерыя Саўко, які вылучаецца па Шчучынскай ВА № 60.

Таксама прыхаванай агітацыяй за старшыню раённага Савета дэпутатаў Таццяну Марачкаву з’яўляецца матэрыял «75-летию подвига посвящается» ў газеце «Крычаўскае жыццё» (№58). Мясцовае кабельнае тэлебачанне паказала некалькі перадач, у якіх Марачкова распавядала жыхарам раёна пра свой удзел ва Усебеларускім народным сходзе.

Наваполацкае кабельнае тэлебачанне «Вектар» паказала перадвыбарчы сюжэт, у якім былі станоўча паказаны праўладны кандыдат Вадзім Дзевятоўскі. Апазіцыйны прэтэндэнт Мікалай Манохін, хаця і даваў на сваім пікеце інтэрв’ю карэспандэнту, у сюжэт практычна не трапіў.

Навасны сайт «ГомельБест» 18 ліпеня апублікаваў інфармацыю пад назвай «Странная компания», у якой у абразлівай форме гаворыцца аб зборы подпісаў за аднаго з патэнцыйных кандыдатаў ад рэгіянальнай апазіцыі.

## НАЗІРАННЕ ЗА ВЫБАРАМІ

Выбарчыя камісіі акрэдытавалі 376 назіральнікаў. Ад палітычных партый акрэдытавана 34 чалавекі, ад грамадскіх аб’яднанняў – 305. У прыватнасці, ад РГА «Белая Русь» назіраць за выбарамі будуць 60 прадстаўнікоў, БРСМ – 60, Беларускага Хельсінкскага камітэта – 48, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі

---

[3] Даступна на: http://www.belta.by/politics/view/vybory-2016-mininform-belarusi-pojasnil-kak-pravilno-vesti-predvybornuju-agitatsiju-v-sotssetjah-202887-2016/#top.

– 43. Яшчэ 35 грамадзян акрэдытаваныя ў якасці назіральнікаў шляхам падачы адпаведных заяў, двое накіраваны працоўнымі калектывамі.

Акрамя таго, ЦВК акрэдытаваў 57 назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У тым ліку ад Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў-удзельніц СНД (МПА СНД) акрэдытавана 8 назіральнікаў.

Другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Сяргей Клішэвіч паведаміў, што БРСМ вылучыць па два назіральнікі на кожны ўчастак, то бок 11942 чалавекі.

Актыўнасць назіральнікаў, вылучаных ад праўладных арганізацый, невысокая.

**“Праваабаронцы за свабодныя выбары”.**